Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (151), 2025

УДК 821.161.3-3*Я.Баршчэўскі:821.111(73)-3*Э.По EDN: TCDWWO

# Увасабленне зла ў празаічнай спадчыне Яна Баршчэўскага і Эдгара По

Л.А. Лешчанка

У артыкуле даследуецца праблема рэпрэзентацыі матываў зла ў прозе Яна Баршчэўскага і Эдгара По. Праводзяцца паралелі паміж беларускай і амерыканскай рамантычнымі плынямі, выяўляецца тыпалагічнае падабенства і агульныя мастацкія прыёмы паэтыкі. Адзначаецца падабенства сюжэтаў і вобразаў у творах беларускага і амерыканскага пісьменнікаў, аналізуюцца розныя аспекты зла, яго прычыны і выбар вобразна-выяўленчых сродкаў для ўвасаблення матыўнага комплексу.
**Ключавыя словы:** кампаратывістыка, рамантызм, зло, Ян Баршчэўскі, Эдгар По.

The paper deals with the issue of representation of the motifs of evil in the prose of Jan Barszczewski and Edgar Poe. Parallels are drawn between the Belarusian and American romantic currents, the typological similarities and common artistic techniques of both authors are revealed. The similarity of plots and images in the works of Belarusian and American writers is noted, various aspects of evil, its causes and the choice of artistic means to embody the motif are analyzed.
**Keywords:** comparative literature, romanticism, evil, Jan Barszczewski, Edgar Poe.

У сучаснай кампаратывістыцы маладых нацыянальных дзяржаў часта назіраецца імкненне сцвердзіць сваю прыналежнасць да сусветнай літаратуры шляхам параўнання і пошуку літаратурных сувязей. Гэта дапамагае выявіць агульныя заканамернасці творчай эвалюцыі і этапы развіцця кожнай асобнай нацыянальнай літаратуры. Аднак кампаратывісцкія даследаванні закранаюць і іншыя аспекты. Імкнучыся прапанаваць канцэпцыю ўсеагульнай гісторыі літаратуры, важна «бачыць літаратуру ў яе цэласнасці і прасочваць працэсы яе станаўлення і развіцця, не звяртаючы ўвагі на моўныя бар’еры», – піша Р. Уэлек [1, с. 41].

Так, не заўсёды падабенстваў літаратурах выклікаецца прамымі кантактамі і ўплывамі, часам навукоўцы маюць справу з аналогіямі, супадзеннямі і адначасовым працяканнем працэсаў. Усе гэтыя з’явы адносяцца да сферы тыпалагічных сыходжанняў, якія і з’яўляюцца прадметам дадзенага даследвання. Адначасова, абіраючы матэрыял для аналізу, трэба ўлічваць, што «комплексныя даследванні будуць мець глебу пад нагамі толькі ў тым выпадку, калі абсяг даследвання будзе абмежаваны ў прасторы і ў часе» [2, с. 182]. Такім чынам, найбольш удалым выбарам будуць аднастадыяльныя даследванні, г. зн. якія прыналежаць адной літартурнай эпосе.

Традыцыйна «зло» ўспрымаецца як каштоўнаснае ўяўленне, супрацьлеглае дабру. Гэта ўніверсалія культуры, якая нязменна знаходзіцца ў фокусе навуковых пошукаў філосафаў, літаратуразнаўцаў, тэолагаў, культуролагаў, якія шукаюць прычыны яго існавання і магчымасці пераадолення гэтай з’явы. У мастацтве рамантызму «стан свету выражаецца праз стан духу» [3, с. 151]. Расчараванне ў выніках Вялікай французскай рэвалюцыі, а таксама ў грамадскім прагрэсе нараджае сусветную жалобу і ўсведамленне таго, што ўсеагульны пачатак можа мець не боскую, а д’ябальскую прыроду.

У спадчыне нацыянальных рамантыкаў сталага перыяду адлюстравана істотная незадаволенасць маральным кліматам развіцця грамадства ў XIX ст. Так, Эдгар По, як і многія яго сучаснікі, здзіўляўся рэзкім супярэчаннем паміж тэорыяй і практыкай буржуазнай дэмакратыі. Амерыканскае грамадства гучна абвяшчала хрысціянскія і асветніцкія прынцыпы, кожны раз бессаромна іх парушаючы. Натуральна, што гэта зрабілася прадметам доўгіх і пакутлівых разваг, водгулле якіх можна знайсці ў творчасці амерыканскіх рамантыкаў. Уласцівая ім засяроджаннасць на індывідуальнай свядомасці схіляла пісьменнікаў шукаць крыніцу гэтага дрэннага становішча ў самім чалавеку, у маральных аспектах асобы.

На землях былой Рэчы Паспалітай вольналюбівыя ідэі беларускіх рамантыкаў стрымлівала пагроза царскіх рэпрэсій. Н.Л. Бахановіч у сваёй манаграфіі адзначае, што прадстаўнікі шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX ст. «па-мастацку супрацьпастаўляюць, з аднога боку, усё традыцыйнае, спаконвечнае, з другога – знешняе, прыўнесенае іншымі

народамі і культурамі, прычым першы кампанент нясе пазітыўны, а другі – часта негатыўны ці сатырычны змест» [4, с. 243]. Сацыяльная і нацыянальная няволя, цэнзура і змена веры, нашэсце чужынцаў знайшлі адлюстраванне ў светаўспрыманні Яна Баршчэўскага. У сваёй творчасці ён асуджае парушэнне хрысціянскіх ідэалаў, хцівасць новых улад і заняпад царквы.

Ян Баршчэўскі вельмі часта цікавіцца тыпамі людзей паталагічных, псіхічна дэфармаваных, якія ахвотна ўваходзяць у кантакт з нячыстымі сіламі, запрадаючы ім свае душы, і дзейнічаюць на шкоду людзям. Беларускі аўтар, ідучы ўслед за іншымі рамантыкамі, побач з хрысціянскімі ідэямі карыстаецца ў сваіх творах язычніцкімі вераваннямі, адлюстроўваючы тое таемнае, эгаістычнае і злое, што існуе ў глыбіні псіхікі чалавека. Яго героі звычайна імкнуцца вырвацца з сетак нячыстай сілы, але не заўсёды гэта ім удаецца. Паводле пісьменніка, у чалавеку суіснуюць два пачаткі: боскі і д'ябальскі. Барацьба паміж імі дае вельмі розныя вынікі і эфекты. Так, героі твора «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» кожную ноч слухаюць апавяданні простага люду, абмяркоўваюць іх і робяць свой выбар паміж дабром і злом.

У адрозненні ад герояў Я. Баршчэўскага, героі Эдгара По часта не маюць выбару, бо зло ўжо жыве ў іх саміх. Таксама няма надзеі на Бога. Ён узгадваецца, але ў герояў няма сапраўднай веры і надзеі на іншасвет, ніхто з іх не шукае паратунку і збаўлення ў рэлігіі.

На старонках навэл Э. По зло ўвасабляецца ў разнастайных формах – вар'яцтва, родавы праклён, помста і г. д. Яно пранізвае саму сутнасць існавання герояў і не паддаецца пераадольванню. Напрыклад, у творы «Д'ябал пярэчання» сцвярджаецца: «*Для адпаведнага складу розуму ды пры адпаведных умовах дух пярэчання робіцца абсалютна неадольным*» [5, с. 114]. Аднак, у адрозненні ад Я. Баршчэўскага, для Э. По вера не ёсць выратаваннем ад жахаў і зямной несправядлівасці. Калі апавядальнік з навэлы «Марэла» ўзгадвае «*пра хрышчэнне як пра магчымасць вызвалення ад жахаў*» [5, с. 20] і вырашае хрысціць дачку, гэта не ратуе яе ад смерці, а яго самога – ад вар'яцтва і пакутаў. А прыгавораны да смерці апавядальнік з навэлы «Д'ябал пярэчання» ставіць нехарактэрнае для сапраўды веруючага чалавека пытанне: «*Сёння я закаваны ў кайданы – і тут! Заўтра я буду вольны ад путаў! Але дзе?*» [5, с. 119], тым самым паказваючы, што пытанне жыцця пасля смерці застаецца для аўтара адкрытым.

Героі ж Яна Баршчэўскага часта шукаюць паратунку ў рэлігіі і заўсёды знаходзяць яго. Чырвонай ніткай праходзіць праз усе яго творы заклік звяртацца да Бога і «*Бог злітуецца*» [6, с. 107]. Так, ваўкалак Марка, асэнсаваўшы свае дрэнныя ўчынкі, спрабуе змяніць у сваім сэрцы злосць на літасць, а таму зноў ператвараецца ў чалавека і кажа, што пасля выратавання ён «*падняў вочы да неба і дзякаваў Богу, што ўратаваў яго ад таго жаху*». А пасля дадае: «*О, як соладка спазнаць міласэрнасць Божую! Жахлівы лёс чалавека можа зраўняцца са звярыным*» [6, с. 135]. Пачварная кабета, ператвораная ў Інсекту, пад канец жыцця звяртаецца да Бога, бо «*трапіла іскра веры і міласэрнасці*» [6, с. 296] у яе сэрца, і Бог ратуе яе. Ксёндз-рэктар, імкнучыся выгнаць са школы жахлівае стварэнне, у якое ператвараецца шкаляр Люцэфуга, загадвае «*запаліць у асобных мясцінах кляштара грамнічныя свечкі, ды так, каб іх святло разлівалася па калідорах*» [6, с. 303] і такім чынам вяртае спакой сваім вучням.

Адзін з аспектаў зла, які інтэрпрэтуюць абодва аўтары, – праява заганаў чалавека. Перш за ўсё гэта адчужэнне ад людзей, эгаізм і хцівасць. Так, у навэле Эдгара По «Маска чырвонае смерці» страшэнная пошасць лютуе ў невядомай краіне. Князь Праспэра кліча да сябе «*тысячу дужых і легкадумных сяброў спасярод рыцараў і паннаў свайго двору*» [5, с. 61] і адыходзіць з імі ў глыбокую адлюднасць аднаго з сваіх умацаваных кляштараў – «*гэта была раскошная й велічная пабудова, твор князевых дзівацкіх і шляхетных густаў*» [5, с. 61]. Негледзячы на тое, што вакол пануе смерць і жах, двор князя можа «*не зважаць на пагрозу заразы*» [5, с. 61].

Аднак, негледзячы на ўяўную бяспеку, падчас маскараду з'яўляецца загадкавая маска Чырвонае смерці. Усе пужаюцца, ніхто не асмельваецца спыніць штукара і сарваць з яго маску. Толькі князь, шалеючы ад гневу, даганяе госця, і калі той раптоўна паварочваецца і глядзіць яму ў вочы, князь падае і памірае. «*І тады, сабраўшы рэшту адчайнае смеласці, збой гулякаў рынуў у чорную залю, і, схапіўшы злавесную постаць, якая стаяла штыўна й нерухома ў цені змрочнага гадзінніка, яны замерлі ў невымоўным жаху, пабачыўшы, што пад магільным убраннем і смяротнаю маскай, якія былі сарваныя з гвалтоўнай лютасцю, не хавалася нічога*» [5, с. 66]. Гэта была сама Чырвоная Смерць. Увесь княскі двор, які

складаецца з гулякаў і распуснікаў, памірае. «*І Цемра, Заняпад і Чырвоная Смерць бязмежна запанавалі над усім*» [5, с. 66]. У гэтай навэле По паказвае чытачам, што зло – гэта не хвароба вакол замка, яно знаходзіцца ў самім чалавеку.

У творчасці Баршчэўскага можна таксама заўважыць інтэрпрэтацыю зла як заганаў чалавека. У апавяданні «Пра чарнакніжніка і пра цмока, што вылупіўся з яйка, знесенага пеўнем» панскі лёкай Карпа, услед за сваім панам, пачынае карыстацца дапамогай шатана і аддаляецца ад простых людзей. З дапамогай магіі ён выгадоўвае сабе крылатага цмока, які носіць яму золата, і хутка становіцца багацеем. Пасля раптоўнага ўзбагачэння Карпа яшчэ больш аддаляецца ад людзей, нікога не слухае і робіць толькі тое, што хоча, «*каб было па-ягонаму*» [6, с. 97].

Так, ён жэніцца на дзяўчыне супраць яе волі і супраць волі яе бацькоў. Вяселле праходзіць без павагі да традыцый простага люду, бо вясковыя звычаі «*яму ўжо здаваліся смешнымі і былі не даспадобы*» [6, с. 100]. Пасля вяселля Карпа пачынае жыць па-панску: будуе дом з вялікімі вокнамі, заводзіць сад, і жыллё яго сановіцца больш падобным «*да шляхетскае сядзібы, чым да простае хаты*» [6, с. 103]. Але далей аўтар кажа, што «*меў Карпа грошы, меў і павагу, але ці ж у гэтым шчасце? Заўсёды ён быў неспакойны ў думках сваіх*» [6, с. 104]. Часта былы лёкай «*заліваў свой неспакой гарэлкаю*» [6, с. 104]. Завяршаецца апавяданне сцэнай пажару: Карпа губляе прыхільнасць свайго памочніка і багаты дом і знікае з вёскі невядома куды.

Такім чынам, Ян Баршчэўскі, разглядаючы прычыны сацыяльнага зла, бачыць іх у эгаізме людзей. «*Прычына ўсяму – глупства шляхты, хцівасць і нязгода паноў*» [6, с. 219]. Прадстаўнікі вышэйшых класаў у яго адказныя за тыя метамарфозы, што адбыліся з іх падданымі, бо ў яго творах «змены» сялян па часе адбываліся пазней, чым падобнае здаралася з панамі.

Так, адмоўная характарыстыка прадстаўнікоў вышэйшага свету пачынае з’яўляцца ў літаратуры XIX ст. Гістарычная праўда патрабавала аб’ектыўнага адлюстравання ў літаратуры тае ролі, якую адыграла панства на беларускіх землях у падзелах Рэчы Паспалітай. У творах Эдгара По прадстаўнікі вышэйшых слаёў малююцца як вытанчаныя і кволыя лэдзі і джэнтэльмены, якія жывуць у заняпадзе, аддаленыя ад рэальнага жыцця і маральна сапсаваныя: узгадаць хаця б Родэрыка Ашэра ці Марэлу.

Вобраз пыхлівага і злога шляхціца, які дбае толькі пра сябе і свае выгоды, пакідаючы народ пакутаваць, ствараюць у сваіх апавяданях і беларус, і амерыканец. Так, ужо ўзгаданы князь Праспэра з навэлы «Маска чырвонае смерці» хаваецца ад страшнай хваробы, не дбаючы пра астатніх: «*Свет за мурамі хай сам пра сябе дбае. Тым часам было глупствам засмучацца або думаць. Князь паклапаціўся пра ўсе магчымыя забавы. Там былі блазны, імправізатары, балет, музыка, Прыгажосць, віно. Усё гэта й надзейная бяспека былі ў мурох. Вонках іх была Чырвоная Смерць*» [5, с. 61].

Баршчэўскі жа вуснамі свайго героя адказвае: «*Мы самі вінаватыя, што д’яблы размножыліся ў нашым краі; прычына ўсяму – глупства шляхты, хцівасць і нязгода паноў; не буду доўга пра гэта гаварыць: гісторыя ўсім вядомая*» [6, с. 219]. На яго думку, шляхціцы «*не разумеюць, што значыць быць добрым чалавекам, а думаюць толькі пра заслугі ды гербы сваіх продкаў. Але чаму ж не пераймаць іх у даўніх цнотах: даўней шанавалі веру і Бог благаслаўляў жыццё*» [6, с. 202].

Часта сваімі ўчынкамі героі і Э. По, і Я. Баршчэўскага быццам намагаюцца пашырыць рамкі звычайнага і дазволенага і наблізіцца да забароненых ведаў. Так, Ян Баршчэўскі прысвяціў гэтаму аспекту зла цэлае апавяданне пад назвай «Горды філосаф». Малады чалавек, полацкі школяр, імкнецца «*розным чынам набыць або прачытаць забароненыя ды антырэлігійныя кніжкі французскіх філосафаў*» [6, с. 304], чытае іх у начы і апавядае прачытанае сваім калегам, пачынаючы з імі дыспуты. Пасля навучання, «*пасяліўшыся ў вёсцы, ён не шкадаваў грошай на сваю бібліятэку. Купляў філасофскія творы на розных мовах без разбору. Моладзі, якая часта збіралася ў яго, каб паслухаць пра высокія матэрыі, ён апавядаў пра цуды, тлумачыў таямніцы прыроды, якіх сам не разумеў, і быў вядомы там як вучоны чалавек, сапраўдны філосаф*» [6, с. 304].

Далей з героем адбываюцца розныя дзіўныя і страшныя здарэнні. Так, у царкве ён нібыта памяншаецца ў памерах, і простыя людзі кажуць пра гэта, «*што Філосаф цяжка правініўся перад Панам Богам*» [6, с. 305]. Наступны раз галава ягоная памяншаецца і становіцца

падобная да «*макавае галоўкі*» [6, с. 306]. «*Філосаф, круцячыся на адным месцы, нейкім пісклявым голасам мармытаў няўцямныя словы. Ледзь вырываліся з грудзей яго ўздыхі, а калі падняў рукі ў неба, імгненна ўбачылі над яго плячыма звычайную чалавечую галаву*» [6, с. 306]. Але ж нічога не можа спыніць героя, і ён нават друкуе «*свае разважанні, што супярэчылі рэлігіі і здароваму розуму, у часопісе*», нягледзячы на папярэджванні старых: «*Якая ж праўда вышэйшая за праўду веры? Бог яе сам аб'явіў у Евангеллі, і гэтая мудрасць, як сонца нябеснае, асвятляе цэлы свет і кажа пра таямніцы. Чалавечы розум няхай супакоіцца, бо гэта за мяжою яго разумення. Памылковыя думкі вядуць народ да бяды, а веру – да ганенняў*» [6, с. 306].

Нарэшце, праз нейкі час Філосаф пачынае губляць спакой, яго агортвае трывога і яму падаецца, што ён бачыць страшныя, жахлівыя з'явы: то побач з ім «*ідзе велізарны шкілет*», то той жа шкілет заходзіць у ягоны пакой і стаіць ля стала – «*тады Філосаф пранізлівым крыкам склікаў да сябе ўсіх, хто быў у доме*» [6, с. 307]. Калі ён спрабуе заснуць, яму здаецца, што «*страшны крывасмок, абапіраючыся спарахнелай рукою*» [6, с. 307], навісае над яго тварам і жахліва заглядае яму ў вочы. Вядома, што «*доўгі час бачачы такія відовішчы, ён зусім перамяніўся: пабляднеў з твару, саслабеў і заўсёды меў неспакойныя думкі*» [6, с. 307]. «*Раней Філосаф быў моцны духам, ні ў што не верыў; цяпер прымхі мучылі яго душу і даводзілі да роспачы*» [6, с. 307]. У канцы апавяданне хвароба нерваў канчаткова даводзіць яго да роспачы. *Калі Філосаф* «*часам пачуе сярод начное цішы стогны ўдода або журботныя савіныя крыкі*» [6, с. 307], то робіцца надзвычай устрывожаным і чакае «*якога-небудзь няшчасця ў доме*». Нават звычайныя рэчы кшталту выцця сабакі выклікаюць роспач, «*бо гэта вешчавала смерць камусьці ў яго доме*» [6, с. 307]. Памірае Горды Філосаф таксама ад жаху, калі аднойчы асада з партрэтам дзеда-нябожчыка ламаецца напалам з гучным стрэлам: «*Гэты выпадак настолькі яго перапалохаў, што праз некалькі дзён ён памёр*» [6, с. 307].

У якасці маралі апавядальнік кажа, што «*цяпер жалезны век*», і «*чалавек лёгка робіцца горшы*» [6, с. 308]. Тут яўна прачытваецца проціпастаўленне сучаснага жалезнага і мінулага залатога веку, асвечанага мараллю і цнотай продкаў.

Героі Эдгара По, радавітыя і адукаваныя, таксама пакутуюць ад душэўных хвароб. Так, Родэрык Ашэр мае «*нервовае расстройства*» [5, с. 27], якое праяўлялася «*ў шматлікіх ненатуральных адчуваннях*» [5, с. 27]. Прыехаўшы да сябра ў госці, апавядальнік разумее, «*што ім завалодаў нейкі ненармальны страх*» [5, с. 27]. Родэрык баіцца загінуць ад жаху, «*ад гэтага неверагоднага вар'яцтва*». «*Такі, менавіта такі, і ніякі іншы, канец мяне чакае. Я так баюся тых здарэнняў, што хутка адбудуцца... не, не іх саміх, а таго, што яны за сабою пацягнуць. Я скаланаюся ад думкі пра любы, нават самы банальны, выпадак, здольны паўплываць на гэтую невыносную душэўную ўзбуджанасць*» [5, с. 27].

У адрозненні ад Я. Баршчэўскага, Э. По спачатку малюе наступствы для характару перасанажа, а ўжо пасля тлумачыць прычыны. Хоць амерыканец і не абазначае наўпрост прычынна-выніковыя сувязі паміж душэўнай хваробай і адукацыяй Родэрыка Ашэра, відавочна, аднак, што прачытаўшы тую літаратуру, якую ўзгадвае апавядальнік, немагчыма не застацца пад уплывам, асабліва маючы тонкую душэўную арганізацыю: «*Нашыя кнігі – кнігі, што доўгія гады былі важнаю часткай разумовага жыцця хворага, – як і варта было чакаць, цалкам адпавядалі ягоным незвычайным уяўленням*» [5, с. 32].

Апавядальнік дастаткова падрабязна пералічвае творы розных навукоўцаў, урачоў, сатырыкаў, гісторыкаў, хірамантаў, палітычных дзеячоў і інквізітараў, якія прэтэндавалі ў свой час на раскрыццё таямніц чалавечага быцця: «*Мы ўважліва вывучалі такія творы, як "Вэр-Вэр" і "Манастыр" Грэсэ, "Бельфагор" Мак'явэлі, "Нябёсы і пекла" Сведэнборга, "Падземнае падарожжа Нікаласа Кліма" Хольберга, "Хірамантыю" Роберта Флада, Жана д'Эндажынэ і Дэляшамбра, "Падарожжа ў блакітную далеч" Ціка і "Горад Сонца" Кампанэлы*» [5, с. 32].

Яшчэ адзін персанаж, які цікавіцца забароненымі ведамі, – апавядальнік, муж Марэлы з аднайменнай навэлы, чыя «*вучонасць... была надзвычайнай*» [5, с. 16]. Доўгі час Марэла дае яму чытаць «*містычныя творы, якія звычайна лічаць проста адкідамі ранняе нямецкае літаратуры*» [5, с. 16]. Апавядальніку падаецца, што ва ўсім гэтым яго розум не браў ніякага ўдзелу і ніякае адценне містыцызму не афарбоўвала яго думак і ўчынкаў. Але потым, схіляючыся над забароненымі старонкамі, ён пачынае адчуваць, як у ім «*абуджаецца*

*забаронены дух*» [5, с. 16]. Муж і жонка разам вывучаюць тэалагічную этыку, і аўтар зноў дастаткова падрабязна, у адрозненні ад Яна Баршчэўскага, пералічвае тыя самыя забароненыя кніжкі і тэмы: «*Неўтаймаваны пантэізм Фіхтэ, Παλιγγενεσία піфагарэйцаў і асабліва вучэнне Шэлінга пра тоеснасць былі найбольш прывабнымі тэмамі для багатага ўяўлення Марэлы. ... Але principium individuationis, ідэя гэтае тоеснасці, якая пасля смерці страчваецца ці захоўваецца навечна, заўжды выклікаў ува мне нястрымную цікавасць, хутчэй нават не праз свае дзіўныя наступствы, а праз усхваляванасць, з якою Марэла згадвала пра гэта*» [5, с. 17].

Аднак пошукі герояў прыводзяць да таго, што жыццё апавядальніка становіцца невыносным: «*Прыйшоў час, калі таямніца мае жонкі пачала прыгнятаць мяне, бы ліхі заклён. Я не мог больш трываць дотыкаў яе бледных пальцаў, ціхае музычнасці яе мовы, бляску яе сумных вачэй*» [5, с. 17]. Праз некаторы час апавядальнік пачыннае жадаць Марэле смерці, але яе «*кволы дух чапляўся за зямную абалонку шмат дзён, шмат тыдняў і надакучлівых месяцаў*», ён праклінае «*горкія дні, гадзіны і імгненні, якія ўсё расцягваліся, як цень пры канцы дня, пакуль слабела яе пяшчотнае жыццё*» [5, с. 19].

Аўтар не раскрывае таямніцы, якім чынам Марэла здолела ажыць пасля смерці і з'явіцца ў целе сваёй дачкі, але можна здагадацца, што чытанне забароненых кніг не прайшло марна. Жыццё апавядальніка становіцца жахам.

У апавяданні «Душа не ў сваім целе» Ян Баршчэўскі таксама выкарыстоўвае матыў рэінкарнацыі. Лекар Саматніцкі, таемнымі лекамі ратуючы іншых ад смерці, «*сам трапіў у большае няшчасце чым смерць*». Пасля смерці ён «*перамяніў цела*» [6, с. 318] і цяпер «*мусіць пакутаваць на зямлі і чакаць, пакуль праб'е гадзіна, прызначаная Богам*» [6, с. 318]. Пачынаючы апавядаць сваю сумную гісторыю, ён кажа: «*Даследчык шукае таямніцы, бяда шукае даследчыка*» [6, с. 320]. Так Я. Баршчэўскі падкрэслівае, што таемныя веды не прыносяць навукоўцам шчасця.

Такім чынам, з прыведзеных прыкладаў бачна, што тэма забароненых ведаў і іх пошукаў хвалюе абодвух аўтараў. Гэтыя пошукі прыводзяць герояў толькі да разбурэння і смерці, а раскрыццё жаданняў і імпульсаў робіць іх быццё невыносным кашмарам. Выбар аўтараў на карысць фантастычных апавяданняў дае героям магчымасць пашырыць нарматыўныя рамкі рэальнасці і выйсці за межы дазволенага.

Падагульняючы, трэба сказаць, што ў сваёй мастацкай спадчыне прадстаўнікі беларускага і амерыканскага рамантызму намагаліся асэнсаваць самыя неадназначныя праблемы быцця, у тым ліку і праблему зла. Яно ўспрымаецца рамантыкамі не толькі ў сваіх знешніх праявах, але і ў глыбокай узаемасувязі з праблемай маральнага ідэала. У абодвух аўтараў назіраецца агульнарамантычная тэндэнцыя апісваць і па-мастацку асэнсоўваць маральны ўпадак на роднай зямлі: яны востра адчувалі наступленне зла і заняпад маралі. У гэтым заключаецца гуманізм творчасці азначаных пісьменнікаў, у гэтым – іх каштоўнасць для новых пакаленняў.

**Літаратура**


1. Wellek, R. Theory of Literature / R. Wellek, A. Warren. – New York : Harcout, Brace and company, 1949. – 404 p.
2. Брунэль, П. Што такое параўнальнае літаратуразнаўства? / П. Брунэль, К. Пішуа, А. М. Русо. – Мінск : Эўрофорум, 1996. – 240 с.
3. Борев, Ю. Б. Эстетика : в 2-х т. / Ю. Б. Борев. – Смоленск : Русич, 1997. – Т. 1. – 576 с.
4. Бахановіч, Н. Л. Аблічча Іншага ў шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX стагоддзя / Н. Л. Бахановіч. – Мінск : Беларуская навука, 2022. – 303 с.
5. По, Э. Маска чырвонае смерці / Э. По. – Мінск : Кнігазбор, 2011. – 550 с.
6. Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі. – Мінск : Міжнар. фонд "Беларускі кнігазбор", 1998. – 476 с.


Гомельский государственный
университет имени Франциска Скорины

Поступила в редакцию 20.05.2025